*В.І. Еўмянькоў* (г. Магілёў, Беларусь)

# ТАЯМНІЦЫ СПРАВЫ ФІЛАМАТАЎ: ПАЧАТАК ПРАЦЭСУ 1823 г.

У айчыннай навуцы да гэтага часу няма спецыяльнага даследавання, прысвечанага філаматам. Існуючыя тэксты маюць або навукова-папулярны характар, або толькі ўскосна датычацца дзейнасці таварыства. Тым не менш, дзякуючы працы А. Мальдзіса, У. Мархеля, К. Цвіркі, А. Брусевіча і інш. беларускае літаратуразнаўства пэўнымі звесткамі ўсё ж валодае. Так, існуюць пераклады на беларускую мову некаторых твораў філаматаў, ёсць спытак з песнямі таварыства. Збольшага вядомыя мэта і задачы яго існавання. Дзякуючы міцкевічавым "Дзядам" беларусы маюць уяўленне пра апошнія дні таварыства, а таксама пра лёс яго ўдзельнікаў (Т. Зана, Я. Чачота, А. Петрашкевіча, І. Дамейкі і інш.).

Аднак у тых звестак, якія ўжо назапашаны, ёсць два, на наш погляд, істотныя недахопы: 1) большасць навукоўцаў працуе не з архіўнымі матэрыяламі, а з тэкстамі-пасрэднікамі; 2) гісторыя філаматаў надта міфалагізаваная, і не ў апошнюю чаргу дзякуючы намаганням польскіх даследчыкаў мяжы XIX – XX стст. Беларусам, якія не маюць магчымасці працаваць у еўрапейскіх архівах, нічога іншага не застаецца, як карыстацца высновамі, аб'ектыўнасць якіх цяжка або немагчыма праверыць.

Дзеля таго, каб унесці ў звесткі пра філаматаў пэўную сістэмнасць, варта перадусім даследаваць архівы таварыства, а таксама дакументы следчай камісіі ўніверсітэцкай адміністрацыі і камісіі, якую ўзначальваў Мікалай Навасільцаў. Усё гэта вымагае грунтоўнага манаграфічнага даследавання, мэта ж гэтага артыкула больш канкрэтная – адказаць на два пытанні: "З чаго сапраўды пачалася справа філаматаў?"; "Ці магло следства мець іншыя вынікі?".

Ва ўсіх без выключэння работах (і польскіх, і беларускіх) афіцыйны пачатак справы філаматаў звязаны з падзеямі 3 мая 1823 г. Пяцёра гімназістаў



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

патрапілі ў турму, а за імі чарга дайшла і да Т. Зана. Калі хоць нейкія звесткі пра студэнтаў універсітэта ў айчыннай навуцы існуюць, то пра вучняў гімназіі амаль нічога невядома (за выключэннем таго, што паведаміў Адам Міцкевіч у "Дзядах"). Як сапраўды разгортваліся падзеі? Звернемся да перапіскі паміж рэктарам Віленскага ўніверсітэта Юзафам Твардоўскім і ваенным генерал-губернатарам Рымскім-Корсакавым. Гэтыя дакументы вядомыя як "Teka Twardowskiego" і былі апублікаваныя ў 1890-я гг.

Адразу заўважым тое, што падкаморы пінскі Юзаф Твардоўскі быў абраны на пасаду рэктара па ініцыятыве князя Чартарыйскага і выконваў свае абавязкі ў перыяд з 1822 па 1824 гг. Менавіта князь прасіў прафесара Анджэя Снядэцкага дапамагчы абраць Твардоўскага на пасаду (гэты ліст Чартарыйскага апублікаваны Міхалам Балінськім у 1865 г.). Такім чынам, ужо будучы рэктарам, Ю. Твардоўскі дае справаздачу аб здарэнні ў 5-м класе Віленскай гімназіі (ліст ад 9 мая 1823 г.): "Napisane było na tablicy jeszcze przed 8-mą godziną rano dużemi literami zdanie: Vivat konstytucya 3 Maja, jak słodkie wspomnienie dla nas rodaków, a drobniutkiemi literami: lecz nie ma ktoby się o nią dopomniał" [1, s. 180].

Пасля чаго, па словах Ю. Твардоўскага, у класе распачалася лекцыя прафесара старажытнай рымскай гісторыі Вашкевіча, які "з той прычыны, што не меў патрэбы ў класнай дошцы, не заўважыў надпісу". Затое яго заўважыў настаўнік рускай мовы Пётр Астроўскі, які неадкладна паведаміў пра здарэнне памочніку дырэктара гімназіі Жылінськаму. "Ten ostatni natychmiast wszedł do sali, na początek lekcyi języka niemieckiego i dawszy surową naganę obecnym uczniom, rozkazał napis zetrzeć z tablicy [1, s. 180].

Жылінські і Астроўскі правялі следства, у працэсе якога высветлілася, што ініцыятарам "акцыі" быў 15-гадовы Міхал Плятэр, які ўвайшоў у клас і пачаў згадваць: "Сёння 3 мая, гадавіна Канстытуцыі", пасля чаго ўзяў крэйду і напісаў на дошцы: Vivat Konstytucya! Ach jak słodkie wspomnienie" [1, s. 181]. Затым вучань Ян Чаховіч дапісаў да першага сказа "3 Maja", а да другога "dla nas Polaków". Юзаф Кулакоўскі, скарыстаў з парады Бенедыкта Касцялкоўскага, паведамляе рэктар Віленскага ўніверсітэта, і выправіў надпіс: замест "Ach" – "O", замест "dla nas Polaków" – "dla nas rodaków". Нарэшце той самы Кулакоўскі пасля лекцыі Вашкевіча дапісаў драбнюткімі літарамі: "< ...> lecz nie ma ktoby się o nią dopomniał".

У гэтых падзеях здзіўляе наступная акалічнасць: пасля таго, як прыкладна 4 або 5 мая высвятляюцца абставіны "эксцэсу" (доўгі час клас не выдаваў аўтараў надпісу), справаздача кладзецца на стол не рэктара ўніверсітэта (як трэба было б чакаць), а віленскага паліцмайстара, а потым і генерал-губернатара. Ужо ад іх Ю. Твардоўскі даведваецца аб здарэнні. Яшчэ больш здзіўляе тое, што адбывалася далей.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

9 мая збіраецца савет універсітэта, які вырашае пакараць гімназістаў: Плятэра і Чаховіча загадваюць пасадзіць на хлеб і ваду тэрмінам на тры дні, Юзафа Кулакоўскага – на 5 дзён, а Касцялкоўскага – на 1 дзень. Пакаранне атрымалі і настаўнікі, і дырэктар гімназіі. Юзаф Твардоўскі ў сваіх дзеяннях быў вельмі рашучы. Яго рапартам Рымскі-Корсакаў быў, як уяўляецца, цалкам задаволены і нават загадаў толькі арыштаваць гімназістаў, а "хлеб і ваду" (як від пакарання) не ўжываць. Адчувалася жаданне і рэктара, і генерал-губернатара як мага хутчэй справу "замяць".

Тым часам 12 мая маці Міхала Плятэра звяртаецца да генерал-губернатара з лістом, у якім даводзіць невінаватасць свайго сына. Савет універсітэта праводзіць паўторнае следства, склікаючы камісію з трох прафесараў: Пелікана, Лабойкі і Даніловіча. Звернем увагу на асобу Пелікана, які быў у апазіцыі да Твардоўскага і, паводле А. Міцкевіча, адыграў прыкрую ролю ў працы следчай камісіі ўжо пад кіраўніцтвам Мікалая Навасільцава.

Калі да 12 мая ў лістах генерал-губернатара адчуваецца лагодны і нават прыязны да рэктара тон, то ўжо пасля 12 мая ўсё карэнным чынам змяняецца. Чаму? Адказаць на гэта пытанне і проста, і складана. Якраз 12 мая на мурах Дамініканскага касцёла, у якім жылі студэнты ўніверсітэта, з'яўляецца надпіс, вельмі падобны, на першы погляд, да надпісу на дошцы гімназіі: "Niech żyje kostytucia 3 Maia. Śmierć Dispotam. Day Boże, gdyby się to sprawdziło..." [1, s. 194]. Трэба сказаць, што ў сваіх лістах да Рымскага-Корсакава Ю. Твардоўскі настойліва даводзіў тое, што выпадак у гімназіі – гэта ўсяго толькі свавольства ("глупства малых") і што Вільня забылася ўжо на Канстытуцыю 3 мая. Надпісы ж на мурах касцёла сведчылі пра адваротнае.

Рапарты з адпаведнымі высновамі патрапілі да вялікага князя Канстанціна ў Варшаву і той даў справе зусім іншы накірунак, запрасіўшы "цывільнага следчага" М. Навасільцава. Менавіта з гэтага самага моманту і пачынаецца сумная гісторыя філаматаў. Аднак звернем увагу яшчэ на адну істотную дэталь: надпіс на мурах касцёла быў зроблены чалавекам, які не ведаў польскую мову. Колькасць і від памылак сведчаць пра тое, што пісаў расіянін. Юзаф Твардоўскі даводзіў, што студэнты ўніверсітэта ніяк не маглі быць аўтарамі падобнага надпісу, але на словы рэктара ўжо ніхто не звяртае ўвагі. 17 мая з'яўляецца загад цэсарэвіча, паводле якога і сам Ю. Твардоўскі апынуўся пад арыштам (выпадак па тых часах выключны).

Такім чынам, "эксцэс" у гімназіі – справа, якая не мела ніякага значэння, і, хутчэй за ўсё, на яе б хутка забыліся і ў савеце ўніверсітэта, і ў канцылярыі генерал-губернатара, каб не жаданне вялікага князя раздуць полымя. Трэба падкрэсліць і тое, што галоўнай мэтай былі не навучальныя ўстановы, а іх куратар князь Адам Чартарыйскі. Менавіта таму "чалавек Чартарыйскага" рэктар Ю. Твардоўскі і апынуўся пад вартай.



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Атрымоўваецца, што нават калі б філаматаў не існавала, іх бы прыдумалі, каб дыскрыдытаваць Чартарыйскага. Пры гэтым трэба ўлічыць, што цкаванне Чартарыйскага пачалося якраз у той час, калі ён рукамі рэктара

Ю. Твардоўскага распачынае рэформы і ўніверсітэта, і Віленскай навучальнай акругі. Трэба таксама ўлічваць і тое, што філаматаў як дзейснага таварыства ў 1823 г. фактычна ўжо не існавала, таму М.Навасільцаву давялося яго літаральна "аднаўляць". Як гэта не сумна прызнаць, але і геніі польска-беларускай культуры (А. Міцкевіч, Т. Зан, І. Дамейка, Я. Чачот), і прафесар Ю. Твардоўскі былі толькі пешкамі ў вялікай палітычнай гульні.

**Літаратура:**


1. *Szelig, D.* Proces filaretów w Wilnie / D. Szelig. – Krakow: Biblioteka uniwersitecka, 1890. – 327 s.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова